Хололей Л.С., студ. гр. 418 ФМИ
БГУКИ
Научный руководитель – Гажевская Т.С.,
канд. пед. наук

# СКРОЗЬ ПРЫЗМУ ЧАСОЎ: МУЗЫЧНАЯ СЦЭНА З АРАТОРЫІ АЛІНЫ БЕЗЕНСОН «ВАНДРАВАННЕ Ў СТАГОДДЗЯХ»

Араторыя «Вандраванне ў стагоддзях» таленавітага беларускага кампазітара Аліны Безенсон была створана ў 2008 годзе на словы вядомай паэтэсы, празаіка, журналісткі Таццяны Мушынскай.

Сучасны беларускі кампазітар Аліна Безенсон скончыла Беларускую дзяржаўную Акадэмію музыкі, а таксама магістратуру па класу кампазіцыі ў Андрэя Юр'евіча Мдзівані. З 1996 года з'яўляецца членам Саюза кампазітараў Рэспублікі Беларусь і Беларускай суполкі сучаснай музыкі. Творчасць Аліны Безенсон ахоплівае розныя жанры: сімфанічная, камерна-інструментальная, вакальная і харавая музыка. Большасць яе твораў напісаны для хора: араторыя "Страцім – лебедзь" по паэме М. Багдановіча, "Stabat Mater Dolorosa", паэма "Спакуса", "Гімн сонцу", харавы цыкл "Фарбы бясконцага руху" на сл. Т. Мушынскай, харавы цыкл "Век маладосці" на сл. М. Карема, апрацоўкі беларускіх народных песень, харавыя мініяцюры.

Араторыя "Вандраванне ў стагоддзях", напісаная для барытона, хора, фартэпіяна і ударных, складаецца з трох самастойных частак: «На прыступках Калізея», «Вечны горад» і «Міражы Венецыі». Кожная з прадстаўленых музычных сцэн, безумоўна, самабытна, але разам яны складаюць адзіны непаўторны музычны вобраз. Аблічча Рыму і Венецыі, іх славутыя помнікі, палацы і плошчы, водар мінулых эпох натхнілі паэтэсу Таццяну Мушынскую і кампазітара Аліну Безенсон. Рым часоў Калігулы і Нерона, Рым першых хрысціянскіх прапаведнікаў, карнавальная Венецыя часоў эпохі Адраджэння і Венецыя сучасная паўстаюць у гэтым творы.

Першая з трох разгорнутых музычных сцэн – "На прыступках Калізея" па сваей форме і зместу ўмоўна падзелена кампазітарам на пяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

частак, кожная з якіх уяўляе сабой адну асобную карціну, адну эру і адзіны гістарычны сюжэт. У першых трох эпізодах ахоплены гістарычныя падзеі перыяду ад пачатку нашай эры да дваццатага стагоддзя: гэта ўзвядзенне Калізея у старажытным Рыме, распяцце Ісуса ў Іерусаліме, і войны бязлітаснага дваццатага стагоддзя . Карціна чацвертая ўяўляе сабой сукупны філасофскі роздум чалавека аб жыцці, падводзіць слухача да адвечых пытанняў і бясконцага пошуку адказаў, вынікам якога ў пятай карціне паўстае велічны эпізод у храме Божым, напісаны на кананічны тэкст.

У першай частцы музычнай сцэны “На прыступках Калізея” разгортваюцца гістарычныя падзеі старажытнага Рыму. Менавіта ў гэтыя часы імператарамі роду Флавіяў быў пабудаваны самы вялікі са старажытных амфітэатраў, адно з найпрыкметнейшых збудаванняў свету, які пазней быў названы Калізеям. Распачынаецца музычная сцэна невялікім інструментальным уступам. Нібыта недзе чуваць цяжкі надыходзячы поступ гладыятара, дух крывавых падзей, дух бою – і вось на арэне прадстае галоўны герой. «Амфітэатр Флавіяў – іначай Калізей. Ад гладыятарскай крыві трыбуны ашалелі…» упэўнена, рашуча гучыць саліст барытон. «Распні яго, хутчэй распні!» адказвае хор з-за сцэны, і прад слухачом маляўніча паўстаюць шматлюдныя перапоўненныя трыбуны Калізея, які з самага пачатку выконваў ролю вялізнай сцэны гладыятарскіх баяў, перавагай чалавечых інстынктаў дзеля жорсткай забавы.

Карыстаючыся шматлікімі сродкамі музычнай выразнасці, Аліна Безенсон абачліва і выразна ўвасабляе ў свім творы дадзены гістарычны сюжэт. Цвёрда, рашуча, насцярожана, прадракаючы крывавыя падзеі, гучыць фартэпіянна-арганны ўступ у сукупнасці з партыяй літаўр. Фартэпіяннай тэме ўласціва некаторая архаічнасць, якая з’яўляеца ўвасабленнем знаменнага распеву і адлюстроўваецца ў розных момантах музычнай сцэны. Строгая метрыка, супадзенне метрычнага і рытмічнага акцэнтаў – усе гэта ўвасабляе ў сабе рашучы, упэўненны поступ і магутныя сцены. Разам з уступам саліста фартэпіянная партыя ўзбагачаецца меладычнай фігурацыяй,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая дадае трывожнасці музычнаму гучанню сола, і, змяняючыся, кожны раз гучыць па-новаму. У вольным рытме, харавым дэкламаваным шматгалоссі, нарастаючай з кожным імгненнем сілай гука ўсе мацней і мацней гучыць людская прага да крывавага відовішча.

Раптоўна карцінка змяняецца – музычны ўступ абвяшчае выхад евангеліста-барытона, які, спяваючы, пераносіць слухача ужо да новай эпохі і падзей. «Другая эра. Іерусаліма ўзгоркі. І крыж цяжкі у Бога на плячах». Разам з салістам акунаемся ўжо ў падзеі старажытнага Іерусаліма. У гэтай частцы прад слухачом паўстае Іісус з Віфліему, асуджаны рымскім намеснікам Понціем Пілатам на пакаранне смерцю і бязлітасна распяты на крыжы. Ён быў чалавекам, прапаведваў свае вучэнне, несучы дабро і цуд, і цярпеў пакуты ад рук чалавечых, і уваскрос дзеля чалавечага збаўлення. «У вачах натоўпу ні спагады, ні адчаю… Распні яго…» гучаць ты я словы. Ішлі вякі, нічога не змянілася, так сама бязлітасны чалавек, жудасны натоўп…

Для музычнага увасаблення другой карціны кампазітарам абраны ўступ, які падобны да першапачатковага сваёй мернасцю і суровасцю. Меладычная лінія саліста становіцца больш выразнай, у параўнанні з першапачатковай з'яўляюцца дробныя працягласці, адчуваецца выразнае імкненне мелодыі ўверх, да яе вяршыні. Усе гэта змяняецца харавой дэкламацыяй "Распні яго, распні…" практычна паўторваючай першую карціну. Ты я ж самыя выкрыкі з натоўпу, нарастаючая дынаміка, сыходзячая меладычная фігурацыя. Дасягнуўшы свайго апагею людскія крыкі раптоўна знікаюць, і прад слухачом паўстае новая музычная карціна.

Наступны эпізод адлюстроўвае гістарычныя падзеі дваццатага стагоддзя. «Ізноуку век другі. Дваццатае стагоддзе. Машына карная. Радкі даносаў…» , – гучыць сола барытона. Пакутнае дваццатае стагоддзе, колькі войнаў яно прынесла чалавецтву, колькі зруйнавала мар, скатавала чалавечага жыцця. Гонка узбраенняў, ваенныя машыны, вераломныя захопніцкія напады, канцлагеры і крэматорыі, здрада і даносы, чалавечы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

боль, пакуты і страх. Хто стаіць за усім гэтым жахам, хто гэтага датычны? Чалавек, – бязгучна праносіцца у думках слухача, – толькі чалавек.

Як цяжкі жалезны ход машын на фарцісіма гучаць фартэпіанныя акцэнты ва ўступе да трэцяй карціны. Партыя саліста напісана паступенна сыходячымі васьмымі працягласцямі, якія чаргуецца з зыбкімі узыходячымі ксілафонавымі пераклічкамі. Дасягаючы меладычнай вершыні кампазітарам пазначаны спад гучнасці да mp, амаль шэптам уступае хор. « Хутчэй распні яго! Хутчэй распні! » гучыць за сцэнай харавая дэкламацыя, але на гэты раз уже не так  шматлюдна, не так рашуча, неяк сціхаючы, ад mp да pp, знікаючы, памірая…

На пачатку чацвёртай карціны па сюжэтнай лініі твора прад слухачом ізноў паўстае евангеліст як увасабленне праўды, ісціны, мудрасці, як вобраз сапраўднага чалавека. «Стаю на прыступках каменных Калізея. Гляджу наперад у вякоў засмужаную даль…»  гучыць філасофскі роздум аб жыцці і сапраўдным прызначанні чалавека. «Няўжо зауседы будзе так?» прамауляе хор, а пасля яго і саліст. У гэтых словах адлюстраваны ўсе думкі і перажыванні галоўнага героя, яго неверагодная любоў і клопат да людзей, а таксама надзея і вера на лепшую будучыню чалавецтва. “І нехта дужы крыкне: «Распні яго! Хутчэй распні!»”  гэтым  воклікам саліста ўвасабляецца ўся турбота і увесь яго роспач, імкненне прымусіць людзей задумацца аб будучым чалавецтва.

Чацвертая карціна арганна-фартэпіанным уступам вяртае слухача да пачатку першай часткі араторыі. Інструментальная і рытмічныя партыі, памер тры чвэрці, – усе гэта было захавана з невялікімі змяненнямі. Партыя саліста напісана ў дынаміцы меца-фортэ, на пачатку ёй уласціва мерная апавядальнасць, на прыканцы яе гучанне становіцца больш эмацыянальным, з’яўляюцца дробныя працягласці, меладычная лінія дасягае сваёй вяршыні. Музычны памер змяняецца на чатыры чвэрці, і ў адказ салісту, нібыта здалеку, на мэца-піана гучыць хор. Інструментальны акампанемент тут выконвае ролю гарманічнай падтрымкі і суправаджэння, у некаторых тактах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фартэпіяна дубліруе частку харавай фактуры. Пачынаючы свае пераклічкі на mp, нагнятаючы, набліжаючыся да кульмінацыі, харавая партыя з сола паступова набіраюць усе большую гучнасць і апошнія словы саліста гучаць ужо на фартісіма, узмацнёныя актаўна дубліруемай фартэпіяннай партыяй. Цяжкімі цвердымі акордамі poco a poco cresc. гучыць фартэпіяна, дакладна паўтараючы меладычную лінію саліста, нарастанне гучнасці дасягае адзнакі чатыры фортэ, дзе з'яўляецца літаўры і агульнае гучанне паступова сціхае.

У пятай частцы музычнай сцэны "На прыступках калізея" слухач раптоўна апыняецца у Храме Божым, дзе прад ім узнікае карціна святога Багаслужэння. Саліст тут выконвае ролю святара, голас якога перамяжоўваецца і ўзмацняецца харавым спевам. Гучаць радкі з шэсцьдзесят шостай главы Псалома «Божа! Будзь літасцівы да нас і дабраславі, і асвятлі нас абліччам Сваім» спявае хор. «Ва ўсіх народах збавенне Твае, хай уславяць цябе ўсе народы!» – хор, саліст, а таксама інструментальнае суправаджэнне ў фінале становяцца адзіным цэлым, урачыста абвяшчаючы веліч Бога, яго сілу і магутнасць.

У адрозненне ад першых чатырох музычных карцін, пятая частка пачынаецца невялікім аднатактным уступам, уяўляючы сабой арганны аккорд, на фоне якога кампазітар уводзіць гучанне званоў. Благадатна, мерна, на працягу ўсей часткі гучаць званы, на фоне якіх у форме чытання нараспеў, у адзіным рытме на mp спявае хор. Спачатку харавія рэплікі чаргуюцца з партыяй саліста, а затым, паступова, разам з узмацненнем гучнасці, дасягнуўшы ff, яны зліваюцца у адзіным рытмічным і меладычным гучанні. Інструментальная партыя таксама становіцца ўсе больш насычанай, узмацняюцца званы, і на апошніх тактах музычнай карціны кампазітар пазначае агульнае ritardando, падкрысліваючы моц, веліч і ўрачастасць фінальнай карціны.

Шмат беларускіх кампазітараў ва ўсе часы імкнуліся дакрануцца да вечнага, сакральнага, невядомага. Гэтыя тэмы вабяць людзей і ў наш нялёгкі час. Ва ўсе гады знаходзілася шмат перашкод паміж царквой і чалавекам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Супраць усіх хрысціянскіх устояў быў пабудаваны Калізей у старажытным Рыме, па загаду чалавека быў бязлітасна распяты Ісус, па чалавечай волі ў дваццатым стагоддзі быў абвешчаны атэізм, было разбурана і спалена шмат храмаў. Вынік заўседы адзін – чалавек неадступна прыходзіць да Бога. У цяжкім становішчы ўсе мы звяртаемся да Бога, просім дапамогі, падтрымкі, шукаем прымірэння і спакою. Менавіта рэлігія, спатканне з Творцам з'яуляецца адной з дамінуючых тэм у творчасці кампазітараў і паэтаў сенняшняга дня. Скрозь прызму часоў будуць гучаць адзіныя тэксты малітваў і ўрачыста ўзносіцца веліч і магутнасць адзінага Бога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ